*С.І. БУСЬКО*

# ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ І ПРАФЕСІЙНЫ ПРАЦОЎНЫ РУХ У БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ У 1895–1904 гг.

Анализируется политика Департамента полиции Российской империи по созданию профессиональных рабочих союзов. Особое внимание уделяется организации полицейского контроля над рабочими в белорусских губерниях в конце XIX – начале XX в. Сделан вывод о том, что провал государственной политики по расколу и подчинению рабочего движения стал одной из причин революции 1905–1907 гг.

The policy of labour-union organization of the Russian Empire Police Department is analyzed. Special attention is paid to the police control over the working people in Belarusian provinces at the end of 19th – the beginning of the 20th century. The author makes a conclusion that the failure of the state policy of the labour movement split and submission was one of the reasons for the revolution of 1905–1907.

Працоўны рух канца 90-х гг. XIX ст. моцна непакоіў урад. Колькасць стачак рэзка ўзнялася за 1895–1900 гг. Разам з тым узрасла і ўпартасць бастуючых, стачкі сталі больш працяглымі. Калі ў 1895 г. у Расійскай імперыі ў 68 стачках прымалі ўдзел 3119 чал., то ў 1899 г. іх колькасць дасягнула 57 498 чал. у 189 забастоўках[1].

Кіраўнікі Дэпартамента паліцыі ў 1890-х гг. выдатна ўсведамлялі, якую моц і сілу ўяўляюць працоўныя, бо цікавасць да працоўнага руху, што ўзмацняўся, сярод правячых колаў узнікала і раней. Так, у 1897 г. Міністэрства фінансаў камандзіравала прафесара Маскоўскага універсітэта І.Х. Озерава ў Вялікабрытанію і ЗША для вывучэння вопыту трэд-юніёнаў. Ужо ў той час прафесар у сваім заключэнні адзначыў: «Еще 10 лет и придется санкционировать профессиональные рабочие союзы в России»[2].

Тлумачачы тактыку ахоўнага аддзялення, кіраўнік Асобага Аддзела Дэпартамента паліцыі С.В. Зубатаў пісаў: «Рабочий класс... будучи разъярен социалистической пропагандой и революционной агитацией в направлении уничтожения государственного и общественного строя, неминуемо мог оказаться серьезнейшей угрозой существующего порядка вещей»[3]. Зыходзячы з гэтай думкі, Зубатаў і Маскоўскае ахоўнае аддзяленне вырашылі ўзяць пад уласны кантроль прафесійны працоўны рух, накіраваць яго ў той бок, які быў пажаданы і карысны для палітычнай паліцыі Расійскай імперыі.

Глава Маскоўскага ахоўнага аддзялення валодаў усёй інфармацыяй аб палітычных працэсах у Заходняй і Цэнтральнай Еўропе, у Асобым Аддзеле была створана спецыяльная бібліятэка выданняў, прысвечаных марксізму ва ўсіх яго праявах. Напрыканцы XIX ст. у Еўропе нарастала супрацьстаянне паміж «рэвізіянізмам» Э. Бернштэйна і артадаксальным марксізмам К. Каўцкага па пытаннях, прысвечаных асноўным палітычным і тактычным палажэнням міжнароднага сацыялізму. Перад заходнееўрапейскімі сацыялістычнымі

партыямі стаяла пытанне: бескампрамісная класавая барацьба ці супрацоўніцтва з ліберальнай часткай грамадства дзеля дасягнення пэўных мэт. Інакш кажучы, сацыяльна-палітычныя рэформы як канчатковая мэта ці толькі сродак на шляху да канчатковай задачы – сацыяльнай рэвалюцыі. Асэнсаваўшы сітуацыю, што склалася на той момант у працоўным руху, і прыняўшы да ўвагі арганізацыйнае афармленне расійскіх сацыял-дэмакратаў у выглядзе БУНДу і РСДРП, Дэпартамент паліцыі дазволіў С.В. Зубатаву правесці эксперымент па стварэнню працоўных прафесійных саюзаў пад эгідай МУС.

Па шэрагу прычын былі абраны тры рэгіёны: Маскоўскі прамысловы раён, Адэская губерня і Паўночна-Заходні край (з цэнтрамі ў Вільні і Мінску). Праз Вільню ішлі амаль усе транспарты рэвалюцыйнай літаратуры з-за мяжы ў Пецярбург і Маскву[4]. У Вільні заўсёды было магчыма знайсці нелегальны часопіс ці брашуру нашмат лягчэй, чым у іншых гарадах. Як вынік віленская інтэлігенцыя была адносна добра знаёма з перадавой сацыялістычнай і рэвалюцыйнай літаратурай (у тым ліку з працамі Бернштэйна, Геркнера, Рузье, Вігуру).

Вільня і Мінск мелі значную яўрэйскую інтэлігенцыю, і яна была больш звязана з працоўнай яўрэйскай масай, чым асіміляваная яўрэйская інтэлігенцыя Польшчы ці поўдня Расіі. Масавая неадукаванасць спрашчала задачу Зубатава. Недарэмна ў Расійскай імперыі быў дазволены «Капітал» К. Маркса, але забаронены яго каментарыі і тлумачэнні[5]. Ідэі Зубатава аб неабходнасці кантролю за працоўным рухам падтрымлівалі кіраўнік Мінскага губернскага жандармскага ўпраўлення (ГЖУ) палкоўнік М.В. Васільеў, мінскі губернатар М.М. Трубяцкі, віленскі генерал-губернатар В.М. Троцкі.

Узаемадзеянне паліцыі і працоўных у беларускіх губернях па вырашэнню спрэчных пытанняў мірным шляхам вядзе адлік з 1893 г., калі віленскія і мінскія працоўныя дабіліся ўвядзення 12-гадзіннага працоўнага дня. Па ініцыятыве прадстаўнікоў мінскай інтэлігенцыі (І. Волін, А. Гурвіч, Ф. Фрумкін) была пачата кампанія па зборы подпісаў за аднаўленне закону, прынятага яшчэ Кацярынай ІІ аб 12-гадзінным працоўным дні сярод рамеснікаў. Петыцыі са шматлікімі подпісамі паўплывалі на губернатара М.М. Трубяцкога: ён выдаў цыркуляр, прадпісаўшы паліцыі сачыць за яго выкананнем (нагляд за рамеснай вытворчасцю ажыццяўляла паліцыя, а не фабрычная інспекцыя). Рабочыя сумесна з паліцыяй абыходзілі майстэрні, наглядаючы за выкананнем цыркуляру[6].

З іншага боку, ідэі актывізацыі палітычнай барацьбы ў супрацьвагу эканамізму распаўсюджваліся сацыял-дэмакратычнымі ППС (Польская Сацыялістычная партыя) и СДКПіЛ (Сацыял-дэмакратыя Польшчы і Літвы); асабліва з 1895 г., калі арганізацыяй гурткоў у Вільні і Мінску па пастанове Лодзінскага з'езда СДКПіЛ займаліся Трусевіч і Роза Люксембург.

Раптоўны рост выступленняў у 1895–1897 гг. прывёў да ўзмацнення кантролю за працоўным рухам з боку Асобнага Корпуса жандармаў. Адбываецца рэформа структур Дэпартамента паліцыі: у 1898 г. вылучаецца Асобы Аддзел, сярод асноўных функцый якога «надзор за политическим настроением рабочих»[7]. Дырэктар Дэпартамента паліцыі С.Э. Звалянскі ў дакладной запісцы, абгрунтоўваючы неабходнасць стварэння Асобага Аддзела, не скрываў сваёй занепакоенасці ўзрастаннем «пропаганды социал-демократического движения среди рабочих»; казаў аб росце стачак на фабрыках і заводах.

Неабходна падрабязней спыніцца на прапановах Зубатава. Сам рэвалюцыйны рух, па яго разліках, магчыма і неабходна выкарыстоўваць у інтарэсах самаўладдзя. На думку кіраўніка маскоўскай «охранки», мэтазгодна шляхам дробных эканамічных саступак адцягнуць працоўных ад рэвалюцыянераў і ўнесці раскол у іх асяроддзе. Методыка прапаноўвалася даволі простая: вырашэнне канфліктаў з прадпрымальнікамі жандармскімі рэсурсамі, кантроль за фабрычна-раменымі адносінамі, дазваленне рабочым пэўнай свабоды і нават «смотреть сквозь пальцы на забастовки, раз в них нет ни уголовщины, ни явной политики»[8].

Ліквідацыі ў Паўночна-Заходнім краі, праведзеныя Лятучым атрадам Маскоўскага ахоўнага аддзялення ў 1898, 1900 і 1901 гг., цалкам знішчылі кіраўніцтва мясцовых сацыял-дэмакратычных арганізацый. Яўрэйская моладзь, якая па словах С.В. Зубатава складала аснову руху, трапіла пад кантроль мінскага губернскага жандармскага ўпраўлення і яго кіраўніка палкоўніка М.В. Васільева. Скарыстаўшы выпадак забастоўкі шчаціншчыкаў, ён выклікаў для абмеркавання праблемы прадстаўнікоў ад бастуючых, затым падпіскай запрасіў фабрыкантаў і прывёў бакі да пагаднення, якое было на карысць працоўным.

Дазвол вольных сходаў сталярам, потым і іншым цэхам, запрашэнне ў якасці кіраўнікоў да суразмоў з рабочымі настаўнікаў дзяржаўных навучальных устаноў Мінска, Масквы і Пецярбурга (напрыклад, архіепіскапа Мажайскага Парфенія, мясцовага архімандрыта Афанасія, настаяцеля Казанскага сабора ў Пецярбургу протаіерэя Арнацкага), арганізацыя літаратурна-вакальных вечарын з удзелам харавых калектываў працоўных – усё гэта знайшло падтрымку. Для сустрэч мінскіх працоўных арэндавалася за жандармскі кошт зала «Парыж» на тысячу чалавек. Дапамогу М.В. Васільеву аказвалі былыя бундаўцы, арыштаваныя ў 1898–1900 гг., але вызваленыя па дамоўленасці з Зубатавым: М. Вільбушэвіч, Ю. Волін, С. Чмярыскі. У якасці асноўных тыпаў арганізацый былі абраны касы ўзаемадапамогі і спажы-

вецкія таварыствы – адзіныя арганізацыі, якія мелі права існаваць, зыходзячы з пастаноў МУС, у Мінску яны ствараліся на падставе яўрэйскіх цэхавых саюзаў-ферэйнаў.

Сярод мінскіх працоўных распаўсюджваецца легальная літаратура па прафесійнаму працоўнаму руху, робяцца спробы да перакладу яе на жаргон, распрацаваны ўстаў клуба (дарэчы, зацверджаны намеснікам міністра ўнутраных спраў). Усе гэта выклікае супраціў БУНДу і РСДРП[9]. Пераход БУНДу да палітычнай барацьбы, перабудова арганізацыі з выключэннем выбарнасці кіраўніцтва і ўмацаваннем цэнтралізму выклікалі незадавальненне простых членаў партыі, частцы кіраўнікоў эканамічнага руху здавалася, што БУНД у імя чысціні сваіх сацыял-дэмакратычных прынцыпаў ахвярue паўсядзённымі інтарэсамі працоўных.

Складаная сітуацыя назіралася ў Вільні, дзе прамысловасць была буйнейшай і працоўны рух больш сталы. Аднак і тут узнікалі сістэмна новыя з'явы: асэнсаванне сваіх уласных патрэбнасцей. Рабочыя са стажам ці «старшие» былі незадаволены бундаўскай сістэмай выхавання мас, якая прымушала глядзець на гаспадара не проста як на контрагента, з якім трэба таргавацца, а як на ворага, супраць якога ўсялякая шкодная справа – дабро[10].

Агульны настрой рабочых у 1901 г. Зубатаў дакладна падкрэсліў цытатай з пісьма рабочага Іосіфа Гольдберга: «…"старший" начинает любить свое дело, свою фабрику и свою работу; ему досадно, если портят материал, если работа не тщательна. У него уже другое отношение к хозяину: более примирительное. Ему нужно другое экономическое движение, не бундовское, движение, которое не провозглашает своим принципом войну без конца, а движение, обещающее социальный мир, на почетных для рабочего условиях, при человеческих отношениях с обеих сторон»[11].

Цікавы погляд Зубатава на значэнне працоўных для ўрада: для яго апора самаўладдзя сярод працоўных – сярэдні клас: людзі, якія маюць прафесійныя навыкі і праца якіх дастаткова аплачваецца, якія зацікаўлены ў выніках сваёй працы. Гэта пазіцыя збліжае яго задумкі з мэтамі сталыпінскай аграрнай рэформы, планамі віленскага біскупа Э. фон Ропа па стварэнню каталіцкіх працоўных арганізацый у Гродне і Вільні. Зубатаў і Васільеў былі знаёмы з папулярнай у канцы XIX ст. энцыклікай папы Льва XIII «Rerum novarum» (1891), якая абвяшчала каталіцкую царкву абаронцай працоўных і згодна з якой галоўнымі фактарамі сацыяльнай перабудовы лічыліся працоўныя саюзы і працоўнае заканадаўства[12].

Новым этапам ва ўсталяванні сістэмы нагляду за прафесійным працоўным рухам з боку Дэпартамента паліцыі стаў дазвол на стварэнне партыі (у 1901 годзе!), адлюстроўваючай інтарэсы прыхільнікаў «экономизма» ў Віленскай і Мінскай губернях. 27 ліпеня 1901 г. у Мінску адбыўся сход рабочых, які пастанавіў заснаваць Яўрэйскую незалежную рабочую партыю. У той жа дзень была надрукавана праграма партыі, афармленая ў чатырох пунктах.

ЯНРП ставіла сваёй мэтай узняць матэрыяльны дабрабыт і духоўны ўзровень яўрэйскай працоўнай масы праз стварэнне прафесійных працоўных аб'яднанняў, распаўсюджванне агульнай і прафесійнай адукацыі і самасвядомасці ў грамадскім жыцці. Члены яе адмаўляліся ад антыўрадавых памкненняў, абяцаючы адстойваць перад адміністрацыйнымі і заканадаўчымі органамі правы і інтарэсы рабочых, імкнучыся да легалізацыі прафсаюзаў у Расіі. Тэкст праграмы рэдагаваўся палкоўнікам Васільевым, пры гэтым асобна падкрэсліваўся паступовы пераход да легалізацыі мірным шляхам; што ішло, між іншым, насуперак тагачаснаму заканадаўству Расійскай імперыі.

Вынікі перавысілі ўсе спадзяванні – за першы год партыя падпарадкавала 15 з 20 рамесніцкіх арганізацый Мінска, палову бундаўскіх арганізацый у Мінскай губерні, пачала распаўсюджваць свой уплыў на Віленскую і Магілёўскую. Падтрымку новаму руху выказалі сіяністкія арганізацыі Паўночна-Заходняга краю, асабліва пасля праведзенага ў Мінску сіяніскага з'езда[13]. Палкоўнік Васільеў нават прапанаваў правесці сустрэчу начальнікаў ГЖУ для абмену атрыманым вопытам.

Аднак сітуацыя была вострай з абодвух бакоў. Незадаволенасць праяўлялі прамыслоўцы, якія гублялі грошы; узрастала агітацыя БУНДу, ППС і РСДРП супраць «независимцев». На думку У.І. Леніна, «зубатовщина – не только полицейская форма уловления неблагонадежных, она учитывает рабочее движение, это организация рабочего класса»[14]. Мірная стачка ў Адэсе, што перарасла ў антыўрадавую дэманстрацыю, дала падставу міністру ўнутраных спраў В.К. Плеве спыніць «особый метод ведения общественных и государственных дел» С.В. Зубатава і распусціць у ліпені 1903 г. ЯНРП[15]. Плеве, актыўны дзеяч палітычнай паліцыі з 1880-х гг., лічыў немэтазгодным ствараць новыя метады барацьбы. Успаміны аб нарадавольцах ён выкарыстоўваў і ў пачатку XX ст., не разумеючы абставін, якія змяніліся, і спецыфікі новага руху. Кіраўнік МУС не асэнсоўваў грамадскі характар рэвалюцыйнага руху, а імкнуўся ўбачыць толькі невялікія суполкі бунтаўшчыкоў. Плеве разлічваў, што знішчэнне лідэраў рэвалюцыі дазволіць супакоіць грамадства[16].

Да гэтага моманту змянілася сітуацыя ў Еўропе. З'езд германскай сацыял-дэмакратычнай партыі, які адбыўся ў Дрэздэне вясной 1903 г., прысвяціў большую частку сваёй працы абмеркаванню пытання аб суадносінах палітычнай і эканамічнай барацьбы ў сацыял-дэмакратычным руху. На гэтым з'ездзе «рэвізіяністы» на чале з Бернштэйнам пацярпелі паражэнне.

У прынятай рэзалюцыі было адзначана, што з’езд асуджае ўсялякае імкненне затушаваць існуючыя класавыя супярэчнасці. Кангрэс, у супрацьвагу наяўным рэвізіяніcцкім памкненням, выказвае ўпэўненасць, што класавыя супярэчнасці не аслабляюцца, але пастаянна абвастраюцца, «што сацыял-дэмакратыя не можа імкнуцца да ўдзелу ў дзяржаўнай уладзе ў буржуазным грамадстве...»[17]. На Сацыялістычным кангрэсе ў 1904 г. у Амстэрдаме гэта рэзалюцыя была прынята абсалютнай большасцю, у тым ліку і прадстаўнікамі РСДРП, ПСР, ППС і інш. Адмовіўшыся, такім чынам, ад ідэі пераадолення супярэчнасцей мірным шляхам.

Правал праграмы главы Асобага Аддзела Дэпартамента паліцыі С.В. Зубатава прывёў да цяжкіх наступстваў. Сваімі ідэямі ён размежаваў працоўны рух, вымусіўшы рабочых вызначыцца са сваімі пазіцыямі ў адносінах да форм і метадаў барацьбы. У асобах С.В. Зубатава і М.В. Васільева імперыя згубіла адну з апошніх магчымасцей вырашыць мірным шляхам працоўнае пытанне, пытанне аб пераводзе працоўнага руху ў межы прафесійных аб’яднанняў па заходнееўрапейскаму ўзору. Гэта з’явілася таксама адной з прычын рэвалюцыі 1905–1907 гг.

[1] Гл.: Рабочее движение в России. 1895 – февраль 1917. Хроника / Сост. И.М. Пушкарева и др. СПб., 2000. Вып. VII: 1901 год. С. 9–11.

[2] Бухбиндер Н.А. О Зубатовщине // Красная летопись. 1922. № 4. С. 317.

[3] Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (ЛДГА). Ф. 419. Воп. 4. Спр. 19. Л. 3–7.

[4] Гл.: Перазич В. Из воспоминаний (1896–1897 гг.) // Красная летопись. 1922. № 5. С. 103–105.

[5] Гл.: Саралиева З.Х. «Капитал» К. Маркса и рабочее движение в России. М., 1975. С. 28.

[6] Гл.: Еврейское рабочее движение в Минске (1895–1903) // Красная летопись. 1922. № 5. С. 124.

[7] Перегудова З.И. Политический сыск России (1880–1917). М., 2000. С. 61.

[8] Корелин А.П. Крах идеологии «политического социализма» в царской России // Исторические записки. 1973. Т. 92. С. 113–114.

[9] Гл.: Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). Ф. 102. 7 спр-ва. Воп. 9. Спр. 1886. Л. 10–15.

[10] Гл.: Schneiderman J. Sergej Zubatov and Revolutionary Marxism: The Struggle for the Working Class in Tsarist Russia. New York, 1976. P. 270–271.

[11] Новое о Зубатовщине // Красный архив. 1922. № 4–5. С. 289–295, 302.

[12] Гл.: Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. СПб., 2004. С. 143.

[13] Гл.: ДАРФ. Ф. 102. 6 спр-ва. Воп. 2. Спр. 346. Л. 3–8.

[14] Ленин В.И. Новые задачи и новые силы // Собр. соч. М., 1960. Т. 9. С. 299–300.

[15] Гл.: Перегудова З.И. Политический сыск России (1880–1917). М., 2000. С. 76.

[16] Гл.: Из общественной жизни // Вестник Европы. 1906. № 3. С. 434–436.

[17] Shub D. The Russian Political Heritage (From the 1850's to the 1920's). New York, 1969. P. 378–380.

Паступіў у рэдакцыю 10.03.09.

***Сяргей Іванавіч Бусько*** – аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар У.К. Коршук.